# Гаючая вада з вытокаў Бацькаўшчыны

*Нататкі з нагоды творчай стажыроўкі беларусаў замежжа*

**Восень — пачатак вучобы не толькі для школьнікаў ці студэнтаў. Менавіта ў гэту пару года, якая, да таго ж, сёлета выдалася на дзіва цёплай, кіраўнікі беларускіх арганізацый замежжа прыязджаюць у Мінск на традыцыйную творчую стажыроўку. Прычым, не толькі для таго, каб навучыцца нечаму новаму або ўзяць з сабой найноўшыя метадычныя распрацоўкі па розных кірунках мастацкай самадзейнасці, а і каб завязаць новыя ці пацвердзіць сталыя стасункі са сваімі знаёмцамі-беларусамі, паглядзець на розныя куточкі Беларусі, а таксама на дзейнасць шэрага культурных устаноў у розных рэгіёнах нашай краіны. Так што тыдзень, праведзены беларусамі замежжа ў Мінску і ў яго ваколіцах, робіцца сапраўды насычаным многімі падзеямі, імпрэзамі і запамінальнымі мерапрыемствамі.**


Удзельнікі творчай стажыроўкі ў БДУКіМ.


Выступае Наталля Карчэўская.


Жанна Раманоўская (злева) з калегай з Латвіі.


Людміла Дзёміна з заслужанай узнагародай.

Фота Юрыя ЧАРНЯКЕВІЧА

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

## ДВА РАЗЫ НА ГОД

Як распавяла "К" дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга Антоненка, чарговая творчая стажыроўка кіраўнікоў замежных беларускіх непрафесійных (аматарскіх) калектываў мастацкай творчасці прайшла ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады.

— З 20 па 26 кастрычніка мы прымаем 20 прадстаўнікоў беларусаў замежжа з Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Эстоніі, — адзначыла Вольга Антоненка. — Дадам, што з улікам вялікай запатрабаванасці, з 2018 года наш Цэнтр пачаў ладзіць ажно па дзве падобныя творчыя стажыроўкі штогод.

Лекцыйныя і практычныя заняткі, майстар-класы па самых разнастайных відах творчасці, культуры, мастацтве правялі для беларусаў замежжа спецыялісты з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча ды Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур.

— Мне вельмі прыемна першы раз прыехаць на творчую стажыроўку ў Беларусь, — адзначыла кіраўнік фальклорнага ансамбля "Сяброўкі", старшыня "Беларускага нацыянальна-культурнага таварыства "Сябры" Галіна Варажбіт. — Спадзяюся знайсці тут новых сяброў, а таксама зразумець што-ніштто з сакрэтаў народных майстроў Беларусі. Таму што, як кажуць, тэорыя без практыкі зусім мёртвая.

Па словах Галіны Варажбіт, на Чарнігаўшчыне сёння пражывае каля 7 тысяч беларусаў, а ў суполку ўваходзяць больш за 110 чалавек. А адна з задач таварыства — завязаць актыўныя сувязі з Беларуссю. І пачатак гэтай працы, дарэчы, ужо закладзены: дзякуючы падтрымцы Пасольства Беларусі ва Украіне, а таксама супрацоўніцтву з Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур суполка нядаўна атрымала дзевяць сцэнічных касцюмаў, шматлікія дапаможнікі і кнігі па традыцыйнай народнай культуры беларусаў.

## ПЛЁН НАРОДНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

Не магу не згадаць пра адзін, вельмі насычаны падзеямі, дзень творчай стажыроўкі. Так, 22 кастрычніка, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў у рамках стажыроўкі адбыўся Міжнародны семінар кіраўнікоў калектываў мастацкай творчасці "Прэзентацыя беларускай нацыянальнай культуры ў краінах замежжа", у якім узялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры Беларусі, БДУКіМа, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, беларусы замежжа і спецыялісты абласных цэнтраў народнай творчасці краіны.

На мерапрыемстве таксама выступіла першы намеснік міністра культуры Беларусі Наталля Карчэўская.

— Вельмі прыемна, што ў іншых краінах захоўваюцца беларускія традыцыі, што за мяжой існуюць калектывы з ганаровымі званнямі, — адзначыла падчас сваёй прамовы Наталля Карчэўская. — Жадаю ўсім удзельнікам Міжнароднага семінара плёну, карыснай работы на ніве нашай беларускай культуры, новых станоўчых уражанняў і поспеху ў працы!


Падчас вандроўкі па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Таксама Наталля Карчэўская ўручыла юбілейны медаль "Сто год дыпламатычнай службы Беларусі" кіраўніку народнага ансамбля беларускай песні "Купалінка" культурнага Цэнтра "Аўтаград", старшыні Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Нёман" гарадской акругі Тальяцi Людміле Іванаўне Дзёмінай (Расія). Як вядома, названая ўзнагарода ўручаецца не толькі дыпламатам, а і кіраўнікам суполак беларусаў за значны ўклад у развіццё і ўдасканальванне знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, прадстаўленне і абарону за мяжой правоў і інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, яе грамадзян і юрыдычных асоб.

Як адзначыла "К" Людміла Дзёміна, пры яе арганізацыі, акрамя "Купалінкі", дзейнічае і дзіцячы ансамбль беларускай музыкі і песні "Зорачкі". Да таго ж, суполкай праводзяцца "Дажынкі", свята беларускай кухні "Калі ласка ў нашу хату", "Купалле" ды многія іншыя. Акрамя таго, дзейнічае дамова аб супрацоўніцтве з Ваўкавыскім раёнам Гродзенскай вобласці Беларусі. Так што кантакты паміж беларусамі Тальяці і іхняй радзімай наладжаны даволі трывалыя. І падчас падобных стажыровак яны, натуральна, яшчэ больш умацоўваюцца.

## ТВОРЧЫЯ БУДНІ ЗЕМЛЯКОЎ

Пасля завяршэння ўрачыстай часткі семінара пачалася работа яго шматлікіх секцый па розных кірунках мастацкай творчасці. А яшчэ пазней прайшоў круглы стол пад назвай "Прэзентацыя беларускай нацыянальнай культуры за мяжой", на якім госці з розных краін дзяліліся з калегамі сваім вопытам.

Скажам, як распавяла старшыня Даўгаўпілскага беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Уздым", кіраўнік установы Даўгаўпілскай гарадской думы "Цэнтр беларускай культуры" (Латвія) Жанна Раманоўская, беларусы, што тут жывуць, традыцыйна ладзяць Міжнародны фестываль народнай культуры "Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе", выставы, канцэрты і розныя імпрэзы.

— Можна сказаць, што наш нацыянальна-культурны Цэнтр у Даўгаўпілсе паступова робіцца інфацэнтрам, які дапамагае ўсталёўваць міжнародныя сувязі, — адзначыла Жанна Раманоўская. — Так, у Цэнтра заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве з установамі культуры Мінска, Браслава, Мёраў, Полацка, Глыбокага, Смаргоні, Зэльвы, Віцебскага раёна, а яшчэ — з Цэнтрам беларускай культуры "Крок" (Вісагінас, Літва) і Аб'яднаннем беларускіх арганізацый "Радзіма" (Талін, Эстонія).

Пры суполцы, якая налічвае да 150 чалавек, дзейнічае гурт беларускай народнай песні "Купалінка", танцавальны калектыў "Лянок", калектыў "Спадчына", тэатральная студыя "Паўлінка" і беларуская нядзельная школа "Вясёлка".

Да слова, дзейнасць Цэнтра спансуецца латышскімі ўладамі. Як патлумачыла Жанна Раманоўская, акрамя беларусаў, падобную бюджэтную падтрымку маюць у Даўгаўпілсе таксама суполкі палякаў і расіян.